# МЕНСКАЕ ЖЫЦЬЦЕ.

**Вярнуўся** з Варшавы ў Менск 31-га сьнежня Начальнік Менскага Округу п. Рачкевіч. У Варшаве п. Рачкевіч меў досіць доўгую аудыенцыю ў Начальніка Дзяржавы Я. Пілсудзкага.

Разам з гэтым п. Рачкевіч разрашыў цэлы рад пытаньняў з Гэн. Кам. Усходніх Зямель, Ю. Асмалоўскім.

Як перадаюць з пэўных крыніц, былі закрануты ўсе важные сучасные пытаньні, пры чым, чыннасьць п. Рачкевіча спадабалася вышэйшым органам улады.

**На праваслаўные Коляды** ўсе праваслаўные служачые установ вызваляюцца ад поўдня 6-га студня да 10-га г. м.